УДК 902/904

# КРАМЯНЁВЫЯ КОМПЛЕКСЫ КУНДСКАЙ КУЛЬТУРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ АЗЁРСКАЙ НІЗІНЫ (ПА МАТЭРЫЯЛАМ ГДГАМ)

***Аляксандр Гаршкоў***
*Гродна, Беларусь*

У дадзеным артыкуле разглядаюцца крамянёвыя комплесы кундскай культуры на тэрыторыі Азёрскай нізіны вывучаныя аўтарам у фондах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Даецца кароткі агляд фізіка-геаграфічных характарыстык рэгіёна, гісторыі даследавання культурнай адзінкі і яе асаблівасці. Аналізуюцца крамянёвыя матэрыялы сабраныя на вышэй адзначанай тэрыторыі.

***Ключавыя словы: археалогія, мезаліт, кундская культура, Азёрская нізіна, крамянёвыя комплесы.***

Тэрыторыя Азёрскай нізіны знаходзіцца ў заходняй частцы Усходне-Еўрапейскай раўніны. Дадзены геамарфалагічнымі раён з'яўляецца часткай Сярэднянёманскай нізіны. Паводле фізіка-геаграфічнага раянавання дадзеная тэрыторыя адносіцца да Заходне-Беларускай правінцыі [3, с. 157].

Гідраграфічны сетка прадстаўлена беларускай часткай сярэдняга цячэння ракі Нёман з прытокамі і шматлікімі азёрамі. У даліне Нёмана вылучаецца серыя тэрас (да 10-12 м), але ў большасці выпадкаў вылучаецца толькі пойма і дзве тэрасы. Пойма мае некалькі узроўняў. Першая надбалконавая тэраса ў вярхоўях ракі 4-6 м, каля Гродна да 11 м. Другая надбалконавая тэраса мае вышыню 7-15 м [1, с. 182]. Найбольш прыдатнымі да засялення былі дзве ніжнія позднеледовіковыя надпоймавыя тэрасы і высокі луг. У аллерод, утварыўся ўступ другой тэрасы р. Нёман. У дрыасе-3 утварыўся уступ першай тэрасы. Радыёкарбоновыя датыроўкі даюць дату ад 10 870 да 11 050 гадоў таму. У канцы барэальнага перыяду сфармаваўся уступ высокага лугу [9, с. 7].

Рэльеф нізіны даволі разнастайны і ўтварыўся падчас апошняга, Паазерскага зледзянення. Характэрнай рысай Азёрскай нізіны з'яўляецца шырокае распаўсюджанне эолавых пяскоў, выдзьмаў, град, катлавін. Выдзьмы маюць розныя формы: асіметрычны ў разрэзе, дзе усходні бок круты, а заходні больш спадзісты. У некаторых выпадках, выдзьмы ўтвараюць доўгія грады [7, С. 115–116].

Полесгу

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца характарыстыка кундскай культуры на тэрыторыі Азёрскага нізіны, вызначэнне асаблівасцяў крамянёвага інвентару і складанне каталога калекцый з кундскімі матэрыяламі фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

**Гісторыя даследавання.** На пачатку барэальнага перыяду на тэрыторыю Азёрскай, Скідзельскай і Любчанскай нізін прыйшлі носьбіты кундскай культуры [1, с. 185]. Кундская культура атрымала сваю назву ад аднаго з паселішчаў каля сучаснага г. Кунда на поўначы Эстоніі [5, с. 66].

Культурная адзінка была вылучана Р. Індрэкам [10, с. 28], але помнікі дадзенай культуры былі вядомы яшчэ ў XIX ст., калі і была адкрыта эпанімная стаянка Кунда [2, с.57; 50, с. 60]. Але да сярэдзіны XX ст., інвентар быў прадстаўлены ў асноўным касцянымі і рагавымі вырабамі [2, с. 57]. Гэты прабел быў закрыты Л. Янітсам і К. Янітсам, якія выявілі, і даследавалі шэраг помнікаў з выразным крамянёвым інвентаром [6, с. 60]. У 1967 г., яны адкрылі, а ў 70-х гг., даследавалі стаянку Пуллі – самую старажыткую стаянку ў Эстоніі, якая добра аблюстроўвае ранні этап кундскай культуры [2, с. 57]. На тэрыторыі Латвіі даследаванні помнікаў кундскай культуры праводзілі Ф. Загорскі, І. Загорская, І. Лозэ [2, с. 57; 6, с. 60]. Што датычыцца тэрыторыі Азёрскай, Скідзельскай і Любчанскай нізін, то пэўныя матэрыялы ў крамянёвых калекцыях з фондаў музеяў і інстытута гісторыі НАН Беларусі вылучыў В. Абухоўскі.

**Тэрыторыя рассялення.** Культура займала тэрыторыю паўднёвай часткі Паўночнай Еўропы, Прыбалтыкі, паўднёвай Карэліі, Прыанежжа, Ленінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі, заходняй і паўночнай частках Беларусі [4, с. 485].

**Генезіс.** Большасць даследчыкаў фінальнага палеаліту і мезаліту бачаць сувязь (часам генетычную) носьбітаў свідэрскай і кундскай культур. Але расійскі даследчык А. Сарокін, з якім пагаджаецца таксама і З. Сульгастоўская лічаць генетычную сувязь вышэй названых культур беспадстаўнай. Абгрунтоўваюць гэта яны тым, што дзякуючы аналізу крамянёвага інвентару праследжваецца поўная адсутнасць крамянёвых вырабаў тыповых для кундскай культуры ў «чыстых» свідэрскіх комплексах і наадварот, тыповыя для свідэрскай культуры формы адсутнічаюць у «чыстых» кундскіх комплекса [2, с. 69].

Галоўнай «з’явай», чаму звязваюць гэтыя дзве культуры, гэта т. зв. постсвідэрскі наканечнік стралы, галоўнай прыкметай якога з’яўляецца плоская рэтуш з тронка ці насады на вентральным баку (брушцы).

Даволі цікавая меркаванне было выказана ў артыкуле В. Абухоўскага [2]. Так, Абухоўскі лічыць, што сам тэрмін «постсвідэрскі наканечнік стралы» не вельмі удалы, а па-другое, пры аналізе падабенства крамянёвага інвентару трэба ўлічваць і астатнія формы тыповыя для свідэрскай і кундскай культур. Адсюль В. Абухоўскім робіцца выснова, што кундская культура сфарміравалася без удзелу свідэрскай па-за межамі, Эстоніі, Латвіі, Літвы, Беларусі, Паўночна – Усходняй Польшчы і трапілі на гэтыя тэрыторыі ў выніку міграцый [2, с. 70].

**Храналогія культуры.** Паводле радыевугляродных дат, атрыманых на тэрыторыі Прыбалтыкі і Паўночнай Еўропы храналагічныя рамкі культуры – сярэдзіна 8–5 тысячагоддзя да н. э. [2, с. 58; 10, с. 29].

**Гаспадарчая дзейнасць.** Аснову гаспадркі «кундайцаў» складала палявання на мядзведзя, лася, дзікага кабана і г.д., а таксама на вадаплаваючых – лебедзя, гагі, вялікага баклана. Вядомы на паселішчах і парэшткі паўночнага аленя, дзікага каня, цюленя. Акрамя таго, вядома, што носьбіты кундскай культуры ведалі дамесціцыраваную сабаку. Знаходкі касцяных гарпуноў, кручкоў, а таксама наяўнасць парэшткаў шчукі, акуня і ліня гавораць аб актыўнай рыбалоўніцкай дзейнасці [5, с. 66].

Для кундскай культуры вядомы пахавальныя помнікі. Найбольш значны, гэта могільнік Звейніекі. Пахавальны абрад – інгумацыя (трупапалажэнне) у ямах, пасыпаных охрай. Памерлы размяшчаўся на спіне, на баку або жываце. Пахавальны інвентар прадстаўлены зброяй з крэмня і косці, упрыгожванняў у выглядзе падвесак з зубоў дзікіх жывёл [5, с. 66; 8, С. 51–52].

Усе даследчыкі кундскай культуры вылучаюць тры этапы: ранні, сярэдні і позні. Ранні этап прыпадае на прэбарэальны перыяд і прадстаўлены стаянкмі Пуллі, Сулягалс, Мілукі і ніжнім пластом помніка Звейніекі 2. Крамянёвы інвентар характарызуецца выкарыстаннем высакаякаснай сыравіны і вялікім індэксам пласціністасці. Асноўную частку нуклеусаў на дадзеным этапе складаюць аднапляцовачныя ад рэгулярных пласцін. Наканечнікі стрэл прадстаўлены трыма тыпамі: з бакавой выемкай, тып Пуллі, сіметрычныя чаранковыя. Разцы ў асноўным на зломе пласцін. Вялікую частку інвентару на ранніх помніках складаюць скрабкі – на ўсечаных пласцінах, канцавыя на адшчэпах, мікралітычныя. Шматлікія рэтушаваныя пласціны-укладышы выкананы з вельмі рэгулярных медыяльных частак пласцін. Сярэдні этап датуецца барэальным перыядам і прадстаўлены стаянкамі Кунда, Умбузі, Крумплева, Замошша 1, Сямёнаў Хутар, Паштува, Лампеджай, верхнім пластом Звейніекі 2. Крамянёвая індустрыя працягвае традыцыі ранняга этапу. У большай ступені для вырабу прылад працы пачалі выкарыстоўвацца крысталічныя пароды каменю. З'явіліся новыя формы: крамянёвыя скрабачы, каменныя цяслы з прышліфаваным лязом. Позні этап знаходзіцца ў межах першай паловы атлантычнага перыяду і прадстаўлены стаянкамі Тырвала, Лепакозэ, Оса, мезалітычнымі пластамі Нарвы і мезалітычнымі пахаваннямі вышэй апісанага могільніка Звейніекі. Крамянёвы інвентар разнастайны і вызначыць культуравызначальныя рысы даволі цяжка. На помніках якія размешчаны на тэрыторыі Беларусі і Літвы з'яўляюцца геаметрычныя мікраліты [2, с. 60].

**Крамянёвы інвентар.** На тэрыторыі Заходняй Беларусі, куды і ўваходзяць тэрытарыяльная Азёрская, Скідзельская і Любчанская нізіны, В. Абухоўскім былі вылучаны наступныя класічныя кампаненты кундскай культуры [2, с. 60]: аднапляцовачныя нуклеусы ад рэгулярных пласцін, конуса- або алоўкападобнай формы, з моцна закругленай, часам акруглай пляцоўкай сколвання. Пляцоўка прамая, са слядамі рэгулярнай падпраўкі.

Пласціны-укладышы з сярэдняй велічыні рэгулярных пласцін, а таксама сячэнні рэгулярных пласцін, пласціны са скошаным рэтушшу канцом, рэгулярныя рэтушаваныя пласціны у залежнасці ад наяўнасці іншых кундскіх знаходак і тэхніка-марфалагічных асаблівасцей, могуць таксама быць аднесены да дадзенай культуры.

Да кундскай культуры можна аднесці скрабкі канцавыя на цэлых і ўсечаных рэгулярных пласцінах.

Укладышы тыпу Боркі які ўяўляе сабой медыяльныя часткі дробных рэгулярных пласцін, дадаткова апрацаваных па адным краі з боку брушка дробнай паўстромкай рэтушшу.

Разцы на зломе пласцін. Але дадзены тып таксама часта ўваходзіць у склад яніславіцкана інвентара. Улічваючы дадзеную акалічнасць В. Абухоўскі адносіў такія разцы да разглядаемай культуры ў залежнасці ад наяўнасці іншых кампанетаў «кундайцаў».

Наканечнікі стрэл прадстаўлены трыма тыпамі. Наканечнік стралы з бакавой выемкай пры насадзе і плоскай рэтушшу з боку брушка на вастрыі. Форма даволі рэдкая ў кундскіх комплексах, тым не менш культуравызначальная. Сіметрычныя наканечнікі стрэл з сустрэчнай паўстромкай або амаль плоскай рэтушшу тронка і паўстромай вастрыя. Сіметрычныя наканечнікі стрэл, тронак якіх выдзелены толькі выемкамі з боку спінкі ці брушка.

Сярод апрацаваных аўтарам матэрыялаў, кундскія рэчы можна выдзеліць сярод крамянёвай калекцыі якая была сабраная Ю. Ядкоўскім ў наваколлях вёсак Гожа – Пальніца – Пералом – Лукавіца у 1904 і 1910 гг. [11; 12]. Зараз гэтыя артэфакты захоўваюцца ў ГДГАМ. Да кундскай культуры можна аднесці бакавыя разцы на зломе пласціны, укладыш і медыяльныя часткі пласцін, канцавыя скрабкі, лістападобны наканечнік стралы, фрагмент тронкавага наканечніка стралы (мал. 1: 3–8;).

Полесгу




*Малюнак 1. 1 – Нуклес; 2,3 – укладышы тыпу Боркі; 4 – скрабок; 5, 6 – бакавыя разцы на зломе пласціны; 7 – лістападобныя наканечнік стралы; 8 – фрагмент чаранковага наканечніка стралы. 1-2, 4 – Малюнкі А. Д. Гаршкова; 3, 5-8 – Малюнкі В. С. Абухоўскага*

ПолесГУ

Таксама да кундайскай культуры можна аднесці знаходку каля вёскі Запур'е (Парэцскага с/с, Гродзенскага раёна) аднапляцовачнага нуклеуса з моцна скругленай пляцоўкай сколвання і дадатковай апрацоўкай контрфронту і ўкладыша тыпу Боркі (мал. 1:1–2).

**Вынік.** Такім чынам, крамянёвыя комплексы кундскай культуры на тэытoрыі Азёрскай нізіны, прадстаўлены толькі матэрыяламі паверхневых збораў у першай палове XX ст. Нягледзячы на даволі прадстаўнічы крамянёвы інвентар з дадзеных помнікаў, існуе патрэба далейшага вывучэння дадзенага рэгіёна шляхам раскопак вядомых помнікаў і пошуку новых з добрай стратыграфіяй.


1. Абухоўскі, В. С. Засяленне тэрыторыі Беларускага Панямоння ў X–V тыс. да н.э. / В. С. Абухоўскі // Культура Гродзенскага рэгіёна: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа: навук. пр. / Адк. рэд. А.М. Пяткевіч. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С. 182–188.
2. Абухоўскі, В. Матэрыялы культуры Кунда на тэрыторыі Заходняй Беларусі / В. Абухоўскі // Супольнасці каменнага і бронзавага вякоў міжрэчча Віслы і Дняпра: Зборнік навуковых артыкулаў памяці Міхала Чарняўскага / уклад. В. У. Ашэйчык, М. А. Плавінскі, В. М. Сідаровіч. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2015. – С. 57–76.
3. Гурскі, Б. М. Фізічная геаграфія Беларусі :Вучэб. дапам. / Б. М. Гурскі, К. К. Кудло, Д. А. Бесараб і інш. Пад. Рэд. Б. М. Гурскага, К. К. Кудло. – Мн. : Універсітэцкае, 1995. – 181 с.
4. Коласаў, А. У. Кундская культура / А. У. Коласаў // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2т. Т.2. Л-Я/ рэдкал.: Т.У. Бялова (гал.рэд.) [і інш.], – Мінск : Беларус. Энцыкл. Імя П. Броўкі, 2011. – С. 485–486.
5. Колосов, А. В. Каменный век Беларуси : пособие / А. В. Колосов. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – 112 с. : ил.
6. Ксензов, В.П. Мезолит Северной и Центральной Беларуси / В.П. Ксензов. – Мінск : Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2006. – 170 с. ; іл. – (Материалы по археологии Беларуси. – 2006. – № 13).
7. Матвеев А. В. Рельеф Белоруссии / А. В. Матвеев, Б. Н. Гурский, Р. И. Левицкая. – Мн. : Университетское, 1988. – 320 с.
8. Мезолит СССР. Археология СССР. / Отв. ред. Л. В. Кольцов. – М. : Наука, 1989 г. – 352 с.
9. Чарняўскі, М.М. Неаліт Беларускага Панямоння / АН БССР. Ін-т гісторыі; Рэд. Д. Я. Цялегін. – Мн. : Навука і тэхніка, 1979. – 144 с., іл.
10. Чарняўскі, М.М. Каменны век Беларусі: Ілюстраваны канспект лекцый / М.М. Чарняўскі . – Мн., 2011. – 135 с.
11. Ядкоўскі, Ю. Ваколіцы Гродна з археалагічнага пункту гледжання. Нататкі з вандровак 1904-1910 гг. Пераклад і каментары Яўгена Махнача і Андрэя Вашкевіча / Ю. Ядкоўскі // Гарадзенскі гадавік. – Кракаў, 2016. – Нумар 4. – С. 91–98.
12. Jodkowski, J. Okolice Grodna pod względem archeologicznym: notatki z wycieczek odbytych w latach 1904–1910 / J. Jodkowski. // Światowit. – Warszawa, 1912. – T. X. – S. 80–88.


Полесгу